4) множество встреч с новыми и очень разными людьми, экскурсии, участие в конкурсах, фестивалях, олимпиадах и конференциях делает студенческие годы насыщенными, яркими и интересными, а значит, незабываемыми.

Слушатели и студенты ФИУ ГрГМУ выбирают обучение на русском или на английском языке. Этот выбор в последующем оказывает влияние не только на восприятие учебного процесса, но и на языковую адаптацию в сфере бытового общения. Студенты, выбравшие обучение на русском языке, уделяют больше внимания языковой подготовке, так как испытывают дополнительные языковые трудности при восприятии, изучении и последующем воспроизведении материала на занятиях по специальности (подобных трудностей у тех, кто обучается на английском, нет). Преимущество студентов, обучающихся на русском, состоит в том, что у них значительно повышается мотивация на занятиях по русскому языку и в сфере бытового общения они используют русский язык чаще и увереннее, чем англоговорящие студенты, выбравшие обучение на английском.

Значительно реже чувствуют ностальгию и меньше испытывают проблем с адаптацией те студенты, которые бывали за границей раньше, до приезда в Беларусь, и поэтому психологически готовы к неизбежным трудностям. Кроме того, быстрой адаптации к жизни в новых условиях способствуют такие личностные качества учащихся, как коммуникабельность (общительность), организованность, сила воли, трудолюбие, любознательность и, безусловно, стремление к самосовершенствованию.

Подводя итоги, отметим, что любые «минусы» могут превратиться в «плюсы», а значит, любые проблемы могут стать преимуществами, если посмотреть на них с другой стороны. Не зря мудрые люди говорят: не можешь изменить ситуацию – измени свое отношение к ней.

## ДАБРАЧЫННАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЭЛІЗЫ АЖЭШКІ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

*УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт»*

*Плаўская В.К., 3 к., 14 гр., ЛФ*

*Кафедра гуманітарных навук*
*Навуковы кіраўнік – к.г.н., дацэнт Сіткевіч С.А.*

Жыла ў Гародні пані Эліза Ажэшка, “малодшая сястра Адама Міцкевіча”, “гродзенская самотніца, стражнічка крэсаў”, “духовая маці ўсіх бедных, змеценых у жмені лёсу, усіх прыніжаных і прыгнечаных”, – так пра яе казалі сучаснікі, а пазней і даследчыкі.



Репозиторий ГрГМУ

Калі загаварыць з нашымі сучаснікамі, стане зразумелым, што кожны нешта ведае пра яе, бачыў, чуў, як бы яна і цяпер жыве ў тым доме, які ў 70-я гады разбурылі і пабудавалі нанова, але не з дрэва, а з блокаў, перанеслі ўглыб да Гараднічанкі і нават па памерах змянілі, а ўнутры ўвогуле нібыта той жа балкон і дэталі разьбы па дрэве ў ганку.

Дзіўна любіла Ажэшка людзей вясковых, як сваіх, заўсёды недарослых, няўдалых дзяцей, якія не ўмеюць ні лічыць, ні зарабляць грошы. Вёскі Квасоўка, Гнойніца, Міневічы, Багатырэвічы, Сухая Даліна, Путрышкі, мястэчка Лунна, маёнтак Свіслач давалі ёй натхненне і матэрыял для творчасці.

Пісьменніца ўважліва вывучала побыт жыхароў з Прынёманскага краю, шмат чытала, вяла актыўную перапіску з літаратарамі розных краін, падтрымлівала сувязі з вучонымі Пецярбурга, Варшавы, Вільні, Львова, займалася асветніцкай і дабрачыннай дзейнасцю, пісала.

Усё жыццё пісьменніцы было звязана з Гродзеншчынай і Прынёманскай зямлёй, якую яна шчыра любіла і адлюстравала ў сваіх творах, насычаных пахамі і фарбамі роднага краю. Яе творчая спадчына вельмі багатая і разнастайная. Гэта каля 150 мастацкіх, літаратуразнаўчых і публіцыстычных твораў і больш за 10 тамоў пісьмаў, якія ўяўляюць сабой важны дакумент эпохі і адначасова своеасаблівы эпісталярны раман, дзе аўтар выступае ў якасці галоўнай гераіні [5, с.246].

Матэрыял для сваіх твораў пісьменніца шукала не толькі ў пушчы і наднёманскіх вёсках, але і ў залах суда, у паданнях і легендах беларускага народа, слухаючы мову і сумныя песні беларускіх сялян. І нібыта з глыбіні беспрасветнага жыцця выраслі раманы і аповесці пра беларускае сялянства, прыгнечанае, абкрадзенае, цёмнае. Але, як маці над калыскаю, нахілялася пісьменніца над яго лёсам і бачыла ў душы яго святло і дабрыню. Не выпадкова беларусы лічылі Ажэшку сваім, блізкім чалавекам, бо яна заўсёды імкнулася дапамагчы людзям у горы.

У 1885 г. Ажэшка ўдзельнічала ў акцыі дапамогі пагарэльцам Гродна, калі ў выніку вялікага пажару шмат людзей засталіся без даху над галавой.

Афіцыйныя дакументы адзначаюць, што згарэла 512 жылых дамоў, у тым ліку 131 каменных, 363 халодных будынкі. Страты домаўладальнікаў склалі 2027 495 рублёў, згарэлі лепшыя крамы горада, тры друкарні, будынак Дзяржаўнага банка і шматлікае іншае [1]. Сэрца пісьменніцы не магло не адгукнуцца на гэтую бяду.

З той пары ў Гродне стаў працаваць камітэт дапамогі пагарэльцам, душой якога стала Эліза Ажэшка. Пані Эліза была ўжо добра вядомая сваімі творамі, надрукаванымі ў пецербургскіх газетах і часопісах. Яна тэрмінова адправіла знаёмым рэдактарам зварот да чытчоў, а рэдактары пісьмы Ажэшкі зараз жа змясцілі на старонках сваіх выданняў. І здарыўся цуд.

З усіх канцоў неабсяжнай Расіі “камітэтчыкам” ў Гродна пацяклі грошы. Неўзабаве “камітэтчыкі” валодалі ўжо фондам добраахвотнай

Рэпазіторый ГрДМУ

дапамогі памерам у 190 000 рублёў – сумай для таго часу каласальнай, калі ўлічыць, што карова каштавала 3 руб., і тыя грошы і паслужылі пачаткам для аднаўленчых работ [3].

Праз некалькі гадоў ад пажару не засталося і следу. Толькі з той пары гродзенцаў быццам бы хто цёплай інтымнай нітачкай назаўсёды звязаў з людзьмі ўсяе Расіі і пані Элізай. Стары і малы ведаў, каму абавязаны. У школах, установах і кватэрах з’явілася шмат партрэтаў з Элізай Ажэшка, а калі ёй здарылася захварэць, гараджане перад яе домам стыхійна выслалі брук саломай, каб не грукацелі вазы і карэты.

Творы Элізы Ажэшкі таксама поўныя спагады да простых людзей. Пісьменніца чым толькі магла, старалася дапамагчы бяздольным. Сведчаннем гэтага з’яўляецца, напрыклад, уладкованы ёю 6 студзеня 1908 г. дабрачынны канцэрт-баль у карысць бедных горада Гродна, пра які распавядаюць архіўныя дакументы. Захаваўся таксама арыгінал афішы гэтага канцэрта.

На прыладу канцэрта-балю было выдаткавана 142 руб. 69 кап., кошт квіткоў – ад 50 кап. да 3 руб. Атрыманы прыбытак склаў 279 руб. 60 кап. Такім чынам, чысты прыбытак складаў 136 руб. 91 кап. Усе гэтыя грошы былі раздадзеныя 14 бедным сем'ям, памеры дапамог склалі ад 5 да 18 руб. Спіс асоб, якія атрымалі дапамогу, змацаваны подпісам самой пісьменніцы [1].

Шмат увагі пісьменніца аддавала асветніцкай і выдавецкай дзейнасці. У 1879 -1882 гг. яна была саўладальніцай бібліятэкі, кнігарні і выдавецтва ў Вільні. За няпоўныя тры гады было выдадзена 22 тысячы кніг, два календары і некалькі нумароў гумарыстычнага часопіса «Альфабэт» [5, с.249].

Памерла Эліза Ажэшка ў сваім доме 18 мая 1910 г. Жалобная імша адбывалася ў Фарным касцёле. Пахавана Ажэшка побач са сваім мужам на мясцовых каталіцкіх могілках.

У доме, дзе жыла Э. Ажэшка з 1894 года да сваёй смерці, з 1967 года дзейнічае пастаянная экспазіцыя, прысвечаная жыццю і творчасці пісьменніцы.

Цікавасць да нашай землячкі, гарачай патрыёткі Прынёманскага краю не згасае і сёння. Круглы год наведваюць яе дом людзі. Гэта і жыхары Гродна, асабліва моладзь, якая прыходзіць са сваімі настаўнікамі, каб паглядзець экспазіцыю і паслухаць расказ аб пісьменніцы, а заадно і пазнаёміцца з юнацкай бібліятэкай і аддзелам замежнай літаратуры абласной бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага, якія размешчаны ў Доме Э. Ажэшка. Многа наведвальнікаў прыязджае і з другіх куткоў нашай краіны, а таксама з-за рубяжа.

Беларускі горад Гродна ўшаноўвае памяць польскай пісьменніцы. У доме, дзе жыла Э.Ажэшка, створана музейная экспазіцыя. Вуліца, на якой ён размешчаны, носіць імя пісьменніцы, там жа стаіць помнік Э. Ажэшка. У Гродне яна пражыла 40 год, тут напісаны яе лепшыя творы. Э. Ажэшка шчыра любіла жыхароў Прынёманскага краю, заўсёды



Репозиторий ГрГМУ

імкнулася ім дапамагчы, займалася дабрачыннай дзейнасцю. Можна з упэўненасцю сцверджаць, што ні адзін пісьменнік не зрабіў столькі для беларускага народа, як Э. Ажэшка.


Спіс літаратуры

1. Батракова, К. Жизнь связанная с Гродно (по документам ЦГИА БССР в г.Гродно) / К. Батракова // Эліза Ажэшка. Бюлетэнь Гродзенскага абласнога аддзялення беларускага фонда культуры і абласной бібліятэкі ім.Е. Карскага. Спецвыпуск, 1991.– С. 2.
2. Гапава, В.І. Эліза Ажэшка: Жыццё і творчасць / В.І. Гапава. – Мінск: Беларусь, 1969. – 232 с.
3. Карпюк, А. "Горад мой – бяссонніца мая!.."/ А. Карпюк // Эліза Ажэшка. Бюлетэнь…– С. 2.
4. Матыс, В. Некаранована каралева / В.Матыс // Эліза Ажэшка. Бюлетэнь…– С. 3.
5. Мусіенка, С.П. Пісьменніца з Прынёманскага краю / С.П. Мусіенка // Памяць: Гіст. – дакум. хроніка горада Гродна. – Мінск: БелЭн, 1999. – С. 245–249.


## ФОРМИРОВАНИЕ У ДОШКОЛЬНИКОВ УМЕНИЯ СРАВНИВАТЬ ПРЕДМЕТЫ И ЯВЛЕНИЯ


*УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»*

*Подрецкая Г.Н., 1 к., (магистрант), педагогический факультет*

*Кафедра педагогики и психологии детства*
*Научный руководитель – профессор Чепиков В.Т.*


Важное значение для улучшения обучения и улучшения качества знаний у младших школьников имеет увеличение их познавательной активности и самостоятельности.

Логические умения (сравнение, обобщение, классификация и другие) – важнейший компонент мыслительной деятельности, ибо одной из существенных характеристик мышления является то, что это логически организованный поисковый процесс, сосредоточенный на разрешаемой проблеме. В процессе обучения дети используют некоторые познавательные операции и часто не знают, с какими умственными действиями они связаны.

В работах большого числа авторов (Ю.К. Бабанского [1], В.В. Давыдова, В.А. Кулько, А.В. Усовой и других) отмечается, что значительное место в мыслительной деятельности ребенка уже в



Репозиторий ГрГМУ